# А. Р. ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ С. С. ЛІНГА

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка 30 сакавіка 1999 года прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С.С.Лінга, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

С.С.Лінг далажыў аб заключэнні кантракта з Газпрамам аб пастаўках газу ў Рэспубліку Беларусь. Было адзначана, што дасягнута дамоўленасць аб зніжэнні цэн на гэты від энерганосьбітаў, якое будзе ажыццяўляцца паэтапна. Паводле ацэнкі прэм'ер-міністра, рэалізацыя гэтай дамоўленасці будзе садзейнічаць прыметнаму павышэнню эфектыўнасці беларускай эканомікі. Такім чынам, падпісанае прэзідэнтамі Беларусі і Расіі ў мінулым снежні Пагадненне аб стварэнні аднолькавых умоў суб'ектам гаспадарання дзвюх краін пачало прыносіць свае рэальныя вынікі.

У час сустрэчы А.Р.Лукашэнкі з С.С.Лінгам абмяркоўвалася становішча ў сельскай гаспадарцы рэспублікі. У сувязі з завяршэннем зімоўкі жывёлы прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць не даспусціць страт пагалоўя і аказаць шэрагу жывёлагадоўчых комплексаў падтрымку ў забеспячэнні кармамі. Прэм'ер далажыў аб рабоце кіраўніцтва Саўміна ў абласцях, у тым ліку выніках выязнога пасяджэння Прэзідыума ўрада ў Гомелі. Кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб правядзенні ў пачатку красавіка селектарнай нарады, на якой будуць падведзены канчатковыя вынікі гатоўнасці рэгіёнаў да веснавой сяўбы.

У ходзе даклада важнае месца было адведзена пытанням сацыяльнай абароны насельніцтва, у тым ліку ўдасканалення сістэмы пенсійнага забеспячэння. Акрамя таго, закранала-ся становішча на спажывецкім рынку. Прэзідэнтам дадзена даручэнне ўраду ўзмацніць работу на тых напрамках, дзе ўзнікаюць праблемы з забеспячэннем некаторымі відамі тавараў. Для больш поўнага насычэння рынку рэкамендавана максімальна выкарыстаць унутраныя магчымасці.

**БЕЛТА.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ